# Праект «Ні дня без думкі аб родным краі»

*Мой горад на Палессі,*
*табе спяваю песню…*

**Асноўная праблема, яе актуальнасць:**

Краязнаўства з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці цэнтральнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна: арганізуюцца сустрэчы з мясцовымі аўтарамі, праводзяцца прэзентацыі новых кніг, выпускаюцца бібліяграфічныя дапаможнікі для раскрыцця краязнаўчага фонду.

Кнігі пісьменнікаў-землякоў вельмі запатрабаваныя і заўсёды знаходзяць жывы водгук сярод нашых чытачоў. Яны прывіваюць любоў і павагу да гісторыі і культуры роднага краю, дапамагаюць паўней адчуць і ўсвядоміць сувязь літаратуры з жыццём, пашыраюць і ўзбагачаюць веды аб родных месцах.

Значна ўзрослы інтарэс да краязнаўства, у тым ліку, краязнаўства літаратурнага, паслужыў повадам для стварэння і рэалізацыі інтэрнэт-праекта (далей – праект) «Ні дня без думкі аб родным краі».

Выйсці на новы ўзровень у абслугоўванні карыстальнікаў, даць магчымасць большай колькасці мазыран дакрануцца да паэзіі малой радзімы – у гэтым і складаецца актуальнасць дадзенага праекта.

Ідэя праекта заключаецца ў наступным: на сайце бібліятэчнай сістэмы рэгулярна будуць размяшчацца аўдыёзапісы вершаў мазырскіх паэтаў, прачытаных супрацоўнікамі бібліятэкі. Старт праекта запланаваны на 15 верасня і прымеркаваны да некалькіх падзей: Дня бібліятэк і Дня горада Мазыра.

**Мэты праекта:**

- прыцягнуць увагу да паэтаў, якія звязаны з Мазыршчынай сваім нараджэннем і творчасцю;
- развіць цікавасць да краязнаўства, выкарыстання культурнай спадчыны рэгіёна.

**Задачы:**

- выйсці за межы бібліятэчнай аўдыторыі з дапамогай віртуальнай прасторы і павялічыць колькасць віртуальных карыстальнікаў;
- пераадолець культурную ізаляцыю розных сацыяльных груп;
- актывізаваць чытацкі інтарэс да рэгіянальнай літаратуры.

**Этапы рэалізацыі праекта:**

- стварыць творчую групу з ліку супрацоўнікаў цэнтральнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна;
- сфармаваць спіс літаратуры для запісу;
- агучыць і запісаць на электронны носьбіт вершы мазырскіх паэтаў;

- размясціць аўдыёзапісы на сайце раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы;
- анансаваць праект праз сродкі масавай інфармацыі.

**Чаканыя вынікі:**
- павелічэнне колькасці віртуальных карыстальнікаў;
- знаёмства гараджан з творчасцю мазырскіх паэтаў;
- рост цікавасці сярод мазыран да культурнай спадчыны роднага краю.

**Распрацоўшчык праекта** Кузоўкіна А. В.

**Выканаўцы праекта:** супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі ім. А. С. Пушкіна

**Тэрміны рэалізацыі:** 2016-2020 гады.

**Мэтавая аўдыторыя:** любы зацікаўлены карыстальнік сеткі інтэрнэт

**Рабочы план рэалізацыі праекта:**
- фарміраванне спісу літаратуры для агучвання
красавік
- агучка і запіс вершаў на электронны носьбіт
май-верасень
- размяшчэнне аўдыёзапісаў на сайце раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы
штодзённа
- анонс праекта праз сродкі масавай інфармацыі
верасень